

АСНОЎНАЯ КРЫНІЦА — УЛАСНЫЯ ІНВЕСТЫЦЫІ **2**

АБНОЎКІ ДА НОВАГА СЕЗОНА **13**




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

+TV ПРАГРАМА

9 САКАВІКА 2024 г. СУБОТА № 49 (30183)


## КОРАТКА

• **Золатавалютныя рэзервы Беларусі на 1 сакавіка склалі $8,219 млрд.**

• Рэзідэнты беларускіх тэхнапаркаў у 2023 годзе павялічылі аб'ёмы выпуску прадукцыі амаль удвая.

• **ДПК: каля 2,6 тысячы грузавікоў і больш за 500 легкавушак чакаюць уезду ў ЕС на граніцы з Беларуссю.**

• Больш за 5 тысяч гектараў маладога лесу плануюць стварыць у Гомельскай вобласці гэтай вясной.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Ірына КАСЦЕВІЧ, міністр працы і сацыяльнай абароны:**

*«Сям'я і дзеці — гэта пра каханне і шчасце, а гэтыя катэгорыі, на мой погляд, не залежаць ад дыплома ці адпрацоўкі. Выдатна, што моладзь думае і бярэ адказнасць за сваю сям'ю. І ў дапамогу ім — дзяржаўная падтрымка, якая прадугледжана для будучых і маладых бацькоў: бясплатнае медыцынскае суправаджэнне жанчыны падчас цяжарнасці і родаў, выдзяленне водпуску па цяжарнасці і родах па месцы вучобы або па месцы работы з выплатай дапамогі за ўвесь перыяд, заахвочвальная дапамога маме за пастаноўку на ўлік у жаночай кансультацыі ў ранніх тэрміны цяжарнасці — да 12 тыдняў. Вялікая справа — дапамога ў сувязі з нараджэннем дзіцяці, якая выплачваецца адначасова і дае магчымасць пакрыць расходы сям'і на ўладкаванне малога дома. Сёння сума да выплаты пры нараджэнні першага дзіцяці складае больш як Br4 тысячы, на другое і наступных — Br5,7 тысячы».*

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «НАМ НЯМА ПЕРАД КІМ ДАВАЦЬ СПРАВАЗДАЧУ, АКРАМЯ СВАЙГО НАРОДА»

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прыняў з дакладам Старшыню Савета Рэспублікі Наталлю Качанаву. На парадку дня — работа Савета Рэспублікі і фарміраванне яго новага саставу. Кіраўнік дзяржавы заўважыў, што ў Палаце прадстаўнікоў цяпер ідзе актыўная падрыхтоўка да пачатку работы новага склікання. Наваспечаным дэпутатам найперш трэба будзе выбраць новае кіраўніцтва, сфарміраваць камісіі і вызначыць іх старшынь. «Я хачу, каб дэпутаты вызначаліся самі, як ім жыць і працаваць», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.**

Савет Рэспублікі — палата тэрытарыяльнага прадстаўніцтва. Члены Савета Рэспублікі выбіраюцца на пасяджэннях мясцовых саветаў дэпутатаў тайным галасаваннем. Ад кожнай вобласці і горада Мінска — па восем чалавек. Яшчэ восем членаў Савета Рэспублікі прызначаюцца Прэзідэнтам Беларусі. Вылучэнне кандыдатаў у члены Савета Рэспублікі пачынаецца ўжо з 12 сакавіка і павінна адбыцца не пазней за 21 сакавіка. Самі ж выбары ў Савет Рэспублікі павінны прайсці 4 красавіка бягучага года.

СТАР. 2



Фота БелТА.

Компас

# ТУРЫСТЫЧНЫ РЭЗОН

## Дзеля якіх падзей варта паехаць па Беларусі?



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

**Гуканне вясны і Масленіца, Ваджэнне стралы і Юр'е, майскі баль у сядзібе Нямцэвічаў, Міжнародны маладзёжны фестываль «Марткантакт» і, безумоўна, міжнародная выстава-кірмаш «Адпачынак-2024» — далёка не поўны пералік цікавых падзей на розныя густы, якія пройдуць гэтай вясной і не пакінуць абыякавымі аматараў турызму. Новыя туры ў рэгіёны Расіі, цікавыя мерапрыемствы ўнутры краіны — каляндарна-абрадавыя, рэлігійныя, культурныя ці тэатральныя — чым парадуе старт турыстычнага сезона ў Беларусі, расказалі спецыялісты.**

### У НОВЫМ ФАРМАЦЕ

Аб'ёмы па колькасці турыстаў, выручкі і лічбаў дапандэмійнага 2019 года ўжо перавышаны, і амаль два гады айчынная турыстычная індустрыя працуе ў новым фармаце.

СТАР. 4

Ноу-хау

# СА ШТУЧНАЙ ПЕЧАННЮ І СІНТЭТЫЧНЫМІ ГЕНАМІ

## Беларускія навукоўцы расказалі пра новыя спосабы лячэння

**Прататып штучнай печані, рэдагаванне геному клетак чалавека для тэрапіі спадчынных і анкалагічных захворванняў, віртуальная рэальнасць для лячэння галавакружэння — гэта не фантастыка, а тэхналогіі сённяшняга дня, створаныя нашымі вучонымі. Пра інавацыйныя метады лячэння і прафілактыкі, распрацаваныя апошнім часам у Беларусі, расказалі навукоўцы і медыкі.**

### Тэрапія віртуальнай рэальнасцю

Летась у клініках было ўкаранёна 977 новых метадаў. У ліку найноўшых распрацовак — тэхналогія атрымання дэвіталізаванага бясклетачнага матрыкса печані чалавека. Тэхналогія забяспечвае практычна поўнае выдаленне клеткавага кампанента з натыўнай тканкі без пашкоджання экстрацэлюлярнага матрыкса. Распрацаваная тэхналогія дае магчымасць



ствараць прататыпы штучнай печані, у тым ліку для прымянення ў клінічнай практыцы. Як растлумачыла **начальнік аддзела навукі Міністэрства аховы здароўя Маргарыта ДОСІНА,** прататып штучнай печані ўжо прымяняецца ў Мінскім навукова-практычным цэнтры хірургіі, трансплантalогіі і гематалогіі.

Яшчэ адна значная распрацоўка — выкарыстанне асяроддзя віртуальнай рэальнасці для лячэння пацыентаў з галавакружэннем. Распрацаваны спецыяльны віртуальны комплекс. На пацыента адзяваюць спецыяльны шлем і задаюць праграму, якая дазваляе паскорыць працэс рэабілітацыі і знізіць галавакружэнне. Пацыент трапляе ў віртуальнае асяроддзе. Выконваючы некалькі зададзеных задач, ён стабілізуе становішча цела ў прасторы.

СТАР. 3

ISSN 1990 — 763X

# «НАМ НЯМА ПЕРАД КІМ ДАВАЦЬ СПРАВАЗДАЧУ, АКРАМЯ СВАЙГО НАРОДА»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«Трэба, каб гэта ўсё было вельмі дэмакратычна. Не для справаздачы камусьці. Нам няма перад кім даваць справаздачу, акрамя свайго народа. Каб гэта было годна, каб фармалізму ніякага не было. Усё-ткі гэта такі экспертны савет — верхняя палата парламента, дзе законы пасля прыняцця Палатай прадстаўнікоў яшчэ раз штудзіруюцца. Таму трэба ўважліва паглядзець на прапанаваныя кандыдатуры, якія будуць выбраны адпаведнымі саветамі», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Усяго ў Савеце Рэспублікі пяць пастаянных камісій. Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на падбор кандыдатур іх будучых кіраўнікоў. Ён падкрэсліў, што да выбару гэтых людзей трэба паставіцца максімальна адказна: «Гэтыя пяць чалавек разам са старшынёй і намеснікам (Савета Рэспублікі) — асноўнае ядро верхняй палаты».

«Хацеў бы ведаць, як разгорнута гэтая работа (таму што яна ўжо ідзе) і якія ёсць праблемы. З пункту гледжання таго, што трэба мне падключацца да нейкіх пытанняў ці не. Парламент нам трэба сфарміраваць, таму што роля яго ўзрастае. І гэта члены Усебеларускага народнага сходу. Гэта, лічы, ядро будзе. Гэта вельмі важна для нас», — рэзюмаваў кіраўнік дзяржавы.

## У тэму

### Чалавек, які прайшоў школу Савета Рэспублікі, мае вялікі досвед

Журналістам Наталля Качанава расказала, што ў час размовы з кіраўніком дзяржавы абмяркоўваліся пытанні фарміравання новага склікання верхняй палаты парламента і задачы, якія яму трэба будзе вырашаць. Размова ішла таксама аб асобных выніках дзейнасці цяперашняга склікання, аб тым, якія яшчэ законапраекты трэба разгледзець, што трэба зрабіць да заканчэння паўнамоцтваў. У адпаведнасці з заканадаўствам з 12 да 21 сакавіка будзе ісці вылучэнне новых членаў Савета Рэспублікі, а 4 красавіка 2024 года павінны адбыцца выбары ў Савет Рэспублікі восьмага склікання.

«Спадзяёмся, што вылучаны будуць прафесійныя, кампетэнтныя людзі, якія будуць з гонарам і годнасцю прадстаўляць кожны рэгіён у палаце тэрытарыяльнага прадстаўніцтва, якой з'яўляецца Савет Рэспублікі», — адзначыла Наталля Качанава.

Спікер падкрэсліла, што члены Савета Рэспублікі выканалі вялікую работу, акцэнт у якой — на рэгіёны. Паколькі на прафесійнай аснове ў Савеце Рэспублікі працуюць толькі сем чалавек, а астатнія — у рэгіёнах, кожны займаецца сваёй справай і яшчэ з'яўляецца сенатарам. «Гэта вялікая адказнасць, якая ўскладаецца на тых, хто будзе прадстаўляць свае вобласці ў Савеце Рэспублікі. Таму павінны прыйсці годныя людзі, якія не лічацца са сваім часам, умеюць працаваць з людзьмі, якія разумеюць задачы, што стаяць перад краінай», — падкрэсліла Наталля Качанава. Яна ўпэўнена, што гэты этап электаральнай кампаніі пройдзе так зладжана і на высокім узроўні, як і выбары ў Палату прадстаўнікоў і мясцовыя Саветы дэпутатаў. «Мы ганарымся сваімі калегамі. З цяперашняга саставу Савета Рэспублікі пяць чалавек ужо сталі дэпутатамі Палаты прадстаўнікоў, 12 — абраны ў мясцовыя Саветы дэпутатаў. Мы сваіх калег віншуем і жадаем ім паспяховай працы. Я дакладна ведаю, што чалавек, які прайшоў школу Савета Рэспублікі, мае вялікі досвед, умее працаваць з людзьмі і ўмее вырашаць задачы, якія сёння стаяць перад нашай краінай і перад нашым народам», — адзначыла Наталля Качанава.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

# У ПЛАНЕ КАНТРОЛЮ І КІРАВАННЯ ЭКАНОМІКАЙ

**Аляксандр Лукашэнка прыняў рашэнне аб назначэнні Аляксандра Ягорава намеснікам кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі. У Палацы Незалежнасці Прэзідэнт правёў з ім рабочую сустрэчу, перадае карэспандэнт БелТА.**

«Пытанне звязана з мадэрнізацыяй сістэмы кантролю і кіравання эканамічнымі працэсамі ў краіне. У нас склаўся ня дрэнны такі пул і група эканамістаў. І ва ўрадзе (фінансістаў-эканамістаў), і ў нашым Нацыянальным статыстычным камітэце, і гэтак далей, — сказаў Прэзідэнт. — І Адміністрацыя Прэзідэнта ў гэтым плане будзе таксама мадэрнізавана. Адміністрацыя — штаб Прэзідэнта. Палітычны штаб. Але пытанні кадравай, ідэалагічнай, эканамічнай работы і прававой таксама — гэта асаблівы кірунак».

Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, пытанні, звязаныя з аналізам і кантролем, у тым ліку за выкананнем даручэнняў Прэзідэнта, прынятых па выніках нарад з членамі ўрада і эканамістамі, часам рэалізоўваюцца не ў поўнай меры.

«Таму, зразумела, патрэбна вось такая сур'ёзная прапрацоўка групай спецыялістаў, якая магла б бачыць гэтыя працэсы», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

«Тое ж самае ў кадрах, ідэалагічнай рабоце і гэтак далей. Гэта мае пытанні, вядома. І тут сур'ёзна будзе ўсё мадэрнізавана. І ўвесь гэты блок у плане кантролю, недзе і кіравання эканомікай, і фінансы будуць выведзены на Адміністрацыю Прэзідэнта», — заявіў беларускі лідар.

Ён таксама патлумачыў, з чым звязаны выбар кандыдатуры Аляксандра Ягорава: «Вы чалавек зусім малады. Вы бачыце маю палітыку аб тым, што пакаленні мяняюцца, прыходзяць новыя людзі. Гэта так павінна быць. Застылага нічога быць не павінна. Я падумаў аб тым, каб вось гэтую піраміду замкнуць на намесніка кіраўніка Адміністрацыі. Але патрэбен малады свежы погляд на гэта. Я сур'ёзна вывучаў вашу кандыдатуру і біяграфію».

Кіраўнік дзяржавы таксама папярэдзіў Аляксандра Ягорава, што яму трэба быць гатовым да таго, каб выказваць і альтэрнатыўны пункт гледжання. «Ведаю вашы адносіны з некаторымі начальнікамі. Некаторых потым вам, калі вы будзеце працаваць і мы прымем такое рашэнне, давядзецца ўзяць і на кантроль. І недзе выказаць сваё меркаванне, якое не супадае з меркаваннем і ўрада, міністраў ды іншых. І Нацыянальнага банка. Таму трэба быць да гэтага гатовым», — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў таксама банкаўскі вопыт Аляксандра Ягорава. «Вы — банкір. Тады мне не трэба будзе браць памочніка Прэзідэнта па банкаўскай сферы», — сказаў ён.

Да гэтага часу Аляксандр Ягораў займаў пасаду старшыні праўлення ААТ «Банк развіцця Рэспублікі Беларусь».

Прыярытэты

# Наша краіна ў лідарах па энергаёмістасці ВУП

**Пра гэта паведаміў намеснік старшыні Дзяржстандарта — дырэктар Дэпартамента па энергаэфектыўнасці Віталь КРЭЦКІ на выніковай калегіі ведамства. Паводле яго слоў, эфектыўнасць работы ў Беларусі на міжнародным узроўні пацвярджаецца інтэнсіўнасцю зніжэння энергаёмістасці айчыннага ВУП, якое складае каля 10 % да ўзроўню 2014 года, што адпавядае тэмпам зніжэння энергаёмістасці сярэднесусветнага валавога прадукту ў 1,1 раза. Сярод прамыслова развітых краін — членаў ЕАЭС Беларусь займае адно з лідзіруючых месцаў. «Поспехі ёсць, але зрабіць трэба яшчэ нямала», — адзначыў кіраўнік дэпартамента.**

## ЗА ЎСТОЙЛІВУЮ ЭКАНОМІКУ

«Пытанні рацыянальнага выкарыстання энергарэсурсаў выходзяць на глабальны ўзровень. Кіраўнікі дзяржаў заклапочаныя тым, каб эканоміка і цяпер, і ў будучыні развівалася ўстойліва, а для гэтага неабходныя адпаведныя запасы энергарэсурсаў. У тым ліку тыя энергарэсурсы, якія ёсць, трэба выкарыстоўваць рацыянальна», — сказаў Віталь Крэцкі.

У прыватнасці, ён адзначыў, што ў нашай краіне работа ў гэтым кірунку праводзіцца ўжо даўно — больш за 30 гадоў: «З моманту здабыцця незалежнасці нашай краіны кіраўніком дзяржавы дакладна вызначаны задачы — павышаць узровень энергетычнай эфектыўнасці і энергетычнай незалежнасці эканомікі».

Цяпер у Беларусі рэалізуецца шостая па ліку Дзяржаўная праграма па энергазберажэнні. «За тры гады рэалізацыі дзяржпраграмы ўсе мэтавыя паказчыкі выконваюцца. Па эканоміі энергарэсурсаў мы ўжо дасягнулі амаль двух мільёнаў тон умоўнага паліва — гэта фактычна 80 % ад мінімальнага порога пяцігадовага задання. Доля мясцовых энергарэсурсаў ідзе з перавыкананнем: пры заданні 16 % мы выканалі 17,4 %, гэта нават з улікам уводу БелАЭС», — падкрэсліў дырэктар дэпартамента.

## АСНОЎНАЯ КРЫНІЦА — УЛАСНЫЯ ІНВЕСТЫЦЫІ

Летась на рэалізацыю энергазберагальных мерапрыемстваў з усіх крыніц фінансавання накіравана амаль 1,089 мільярда рублёў, з іх на фінансаванне мерапрыемстваў па павышэнні эфектыўнасці — амаль 985,8 мільёна рублёў (90,5 %), павелічэнні выкарыстання мясцовых паліўна-энергетычных рэсурсаў (ПЭР), у тым ліку аднаўляльных крыніц энергіі (АКЭ) — звыш 103 мільёнаў рублёў (9,5 %).

Як адзначыў Віталь Крэцкі, асноўнай крыніцай фінансавання энергаэфектыўных мерапрыемстваў у справаздачным перыядзе выступілі ўласныя сродкі арганізацый, доля ўдзелу якіх у агульным аб'ёме інвестыцый склала 71 %. Доля мясцовых бюджэтаў склала 21,5 %, доля сродкаў рэспубліканскага бюджэту — 3,3 %.

Акрамя таго, «будаўніцтва энергакрыніц на мясцовых ПЭР спрыяе ўстойліваму развіццю рэгіёнаў, забяспечвае раёны ўласнымі энергарэсурсамі, павышаючы ўзровень іх энергетычнай бяспекі», — падкрэсліў Віталь Крэцкі.

Паводле яго слоў, меры па павелічэнні выкарыстання мясцовых ПЭР дазволілі дасягнуць значных вынікаў па долі выкарыстання мясцовых ПЭР у кацельна-пячным паліве (КПП) па раёнах краіны: з доляй менш за 50 % налічваецца 44 раёны; з доляй ад 51 % да 70 % — 29 раёнаў; з доляй звыш 70 % — 45 раёнаў.

«Будаўніцтва новых сучасных і цалкам аўтаматызаваных кацельняў на мясцовых ПЭР аказвае комплексны эфект і спрыяе не толькі зніжэнню спажывання імпартаванага прыроднага газу і сабекошту вытворчасці цеплавой энергіі, але і дазваляе ствараць дадатковыя новыя працоўныя месцы як на самой кацельні, так і ў арганізацыях рэгіёнаў, якія займаюцца нарыхтоўкай, вытворчасцю і транспарціроўкай драўнянага і тарфянога паліва, вырабам сучаснага айчыннага асноўнага і дапаможнага кацельнага абсталявання», — адзначыў кіраўнік дэпартамента.

Як прыклад праведзенай работы па павелічэнні выкарыстання мясцовых ПЭР ён прывёў увод у эксплуатацыю энергакрыніц на драўняным паліве ў Віцебскай вобласці (Віцебск і гарадскі пасёлак Лёзна). На кацельнях установлены катлы айчыннай вытворчасці. Рэалізацыя гэтых праектаў дазволіла не толькі павялічыць выкарыстанне мясцовых ПЭР, але і знізіць сабекошт вытворчасці цеплавой энергіі на 10—19 %.

## ЗАМКНЁНЫ ЦЫКЛ ПЕЛЕТНАЙ ВЫТВОРЧАСЦІ

У 2021—2025 гадах у рамках рэалізацыі дзяржпраграмы аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам запланавана будаўніцтва ў арганізацыях ЖКГ 95 энергакрыніц на мясцовых ПЭР агульнай цеплавой магутнасцю 526,7 МВт. «За апошнія тры гады ўведзены ў эксплуатацыю 40 энергакрыніц сумарнай цеплавой магутнасцю 220,1 МВт, што дасць магчымасць забяспечыць павелічэнне штогадовага аб'ёму выкарыстання мясцовых ПЭР на велічыню парадку 62,6 тысячы тон умоўнага паліва», — паведаміў Віталь Крэцкі.

У мінулым годзе ўведзены ў эксплуатацыю дзевяць энергакрыніц на мясцовых ПЭР (33,4 МВт) з 14 (48,1 МВт), прадугледжаных дзяржпраграмай. І яшчэ. У нашай краіне праводзіцца актыўная работа па максімальна магчымым выкарыстанні драўняных рэсурсаў. «Для выкарыстання незапатрабаваных рэсурсаў (нізкаякасныя аб'ёмы драўніны), а таксама забеспячэння поўнага замкнёнага цыкла перапрацоўкі і стварэння безадходных вытворчасцяў ствараюцца пелетныя вытворчасці. У цяперашні час у краіне створана 64 пелетныя вытворчасці сумарнай магутнасцю каля 900 тысяч тон паліва ў год», — распавёў Віталь Крэцкі.

Ён адзначыў, што ў параўнанні з іншымі відамі цвёрдага паліва пелеты адрозніваюцца высокай цеплааддачай, нізкай попельнасцю, бяспекай, экалагічнасцю вытворчасці і эксплуатацыі. «Таксама пелеты практычныя і зручныя ў захоўванні, бо вызначаюцца высокай шчыльнасцю, што дазваляе эканоміць месца на складзе і скарацiць выдаткі пры транспарціроўцы. Паліва цалкам экалагічна чыстае, а значыць, пры гарэнні заўважаюцца мінімальныя выкіды ў атмасферу і зольных рэшткі, якія можна ўжываць як угнаенне ў глебу», — растлумачыў кіраўнік дэпартамента.

Было адзначана, што ў краіне прыняты комплекс мер па павелічэнні выкарыстання пелет, якім прадугледжваецца значнае павелічэнне выкарыстання пелет на ўнутраным рынку. Вядзецца перадпраектная прапрацоўка рэканструкцыі энергакрыніц «Белэнерга» і ўстаноўкі пелетных катлоў на 31 кацельні ЖКГ.

Летась ажыццёўлена рэканструкцыя кацельні дзяржаўнай прыродаахоўнай установы «Нацыянальны парк «Прыпяцкі», сумарная цеплавая магутнасць кацельні — 3,5 МВт, уведзена ў эксплуатацыю і мадэрнізавана 179 кацельняў (12 МВт) з гадавым аб'ёмам выкарыстання пелет амаль 3,5 тысячы тон. Выдадзена 31 рашэнне аб узгадненні перадпраектнай дакументацыі на будаўніцтва крыніц цеплавой энергіі, праца якіх плануецца з выкарыстаннем пелет, сумарнай цеплавой магутнасцю пелетных катлоў каля 37 МВт і гадавым аб'ёмам выкарыстання пелет прыкладна 13,8 тысячы тон паліва.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# СА ШТУЧНАЙ ПЕЧАННЮ І СІНТЭТЫЧНЫМІ ГЕНАМІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

А два новыя метады — лячэнне і медпрафілактыка цяжкіх форм бронхалёгачнай дысплазіі ў неданошаных дзяцей, а таксама лячэнне парушэнняў псіханеўралагічнага развіцця ў неданошаных дзяцей — увогуле ўнікальныя для ўсяго свету. Напрыклад, метад лячэння і медпрафілактыкі цяжкіх формаў бронхалёгачнай дысплазіі выкарыстоўваўся ў васьмі дзяцей, якія нарадзіліся ў тэрміне ад 22 да 32 тыдняў. У дзяцей з нізкай і экстрэмальна нізкай масай цела, якія атрымалі клетачную тэрапію, цяжкіх формаў бронхалёгачнай дысплазіі не развілося. Працягваецца назіранне і прымяненне гэтага прадукту.

Клетачная тэрапія паказала сваю эфектыўнасць і пры лячэнні парушэнняў псіханеўралагічнага развіцця ў неданошаных дзяцей, якія нарадзіліся на гэтым жа тэрміне. Пацыенты назіраюцца на працягу чатырох гадоў.

У гэты перыяд ніводнае дзіця не атрымала інваліднасці. Да года дзеці дасягаюць такога ж стану, як і даношаныя дзеці. Такім метадам ужо пралечана 20 пацыентаў.

Сярод эфектыўных новых метадаў — лячэнне пацыентаў з рэфрактарнымі і рэцыдыўнымі формамі CD19-пазітыўных лейкозаў і лімфом з ужываннем анты-CD19 CAR-T-клетак чалавека, якое прымяняецца ў РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава. А ў РНПЦ дзіцячай анкалогіі, гематалогіі і імуналогіі з 2021 года праводзіцца аднацэнтравое адкрытае праспектыўнае пілотнае клінічнае даследаванне анты-CD19 CAR-T-клеткавай тэрапіі пры рэфрактарным / рэцыдывіруючым вострым В-лімфабласным лейкозе ў дзяцей і маладых дарослых.

У РНПЦ псіхічнага здароўя распрацаваны метад лячэння пацыентаў з агульным расстройствам псіхалагічнага развіцця і спецыфічнымі расстройствамі развіцця маўлення і мовы ва ўзросце ад чатырох да дзесяці гадоў з прымяненнем транскраніяльнай магнітнай



стымуляцыі і нейратрэнінгу. Гэты метад прымяняецца пры лячэнні дзяцей-аўтыстаў. Распрацаваны трэнінг дае магчымасць ім хутчэй сацыялізавацца.

## Тэхналогіі будучыні

У Інстытуце біяарганічнай хіміі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі адзначаюць вялікія поспехі ў сінтэзе сінтэтычных генаў.

— Сінтэзуюцца дастаткова вялікія малекулы. Шэраг такіх сінтэтычных генаў за мяжой выкарыстоўваецца для лячэння найцяжэйшых спадчынных захворванняў. Прычым гэтыя прэпараты і курс лячэння для пацыента каштуе часам мільён долараў, — расказала **намеснік дырэктара па навуковай і інавацыйнай рабоце — начальнік НВЦ «ХімФармСінтэз» Інстытута біяарганічнай хіміі НАН Беларусі Алена КАЛІНІЧЭНКА.**

Сам сінтэз і методыка лячэння вельмі няпростыя. Зрэшты, дзякуючы сучаснай тэхніцы і новым падыходам гэта стала менш працаёмка, чым было некалькі гадоў таму. Пры гэтым перспектывы ў тэхналогіі вельмі вялікія. Яна будзе даступна для атрымання самых генаў. Гэтыя ж гены будуць скарыстаны як лекавы сродак для лячэння прыроджаных дэфектаў. Яны дапамагаюць выправіць дэфекты і нармалізаваць дзіцця.

НВЦ «ХімФармСінтэз» вырабляе і прэпараты для лячэння анкалагічных захворванняў. Па некаторых з іх ён займае 20 працэнтаў расійскага рынку. Размова ідзе аб трох прэпаратах для лячэння раку.

— Цяпер мы рэгіструем яшчэ чатыры прэпараты ў Расіі, і, я думаю, нам удасца заняць добрую нішу. Гэта таксама анкалагічныя прэпараты, — адзначыла Алена Калінічэнка.

Мець шэраг пераваг на рынку дазваляе выбраная стратэгія — пачынаць вытворчасць з сінтэзу фармацэўтычных субстанцый. Менавіта дзякуючы гэтаму павялічыўся экспарт. Амаль 50 працэнтаў усёй прадукцыі, якая выпускаецца, ідзе пераважна на расійскі рынак. Цяпер Акадэмія навук рэалізуе на базе НВЦ інавацыйны праект па стварэнні новай вытворчасці.

НВЦ вырабляе ці арыгінальныя рэчывы, ці першыя джэнерыкі, што заўсёды вельмі цяжка.

— Як правіла, няма дакументацыі, фармакапеяй гэта не апісана, таму што кожная фірма захоўвае свае інтарэсы, — заўважыла Алена Калінічэнка. — Калі вы хочаце зрабіць найсучаснейшы прэпарат, вы павінны прарабіць той жа шлях, што і шлях арыгінала, гэта значыць пачынаць з нуля. Адзінае, вядома, што гэтая малекула будзе дзейнічаць на пэўнае захворванне. Калі б мы бралі гатовыя субстанцыі, напэўна, два гады займала б распрацоўка прэпарату. Мы пачынаем з атрымання субстанцыі, і гэта часта займае чатыры гады. Затое дае нам пэўную перавагу пры экспарце нашай прадукцыі ў Расію.

Тут жа распрацоўваюць тэхналогію пралангаванага вызвалення таблеткі. Яна дзейнічае не адразу, а праз некаторы час пасля таго, як чалавек прыняў лекі. НВЦ «ХімФармСінтэз» ужо мае досвед вырабу такіх таблетак, але цяпер тут асвойваюць новую тэхналогію. Гаворка ідзе аб прэпараце для лячэння рассеянага склерозу. На распрацоўку тэхналогіі спатрэбіцца трычатыры гады.

Гаворачы аб сінтэзе фармацэўтычных субстанцый, Алена Калінічэнка адзначыла, што хімікі НВЦ валодаюць рознымі метадамі і могуць або дастаткова эфектыўна распрацаваць новую тэхналогію або палепшыць тую, што існуе. У гэтым і ўнікальнасць НВЦ, што ён не закупляе гатовыя субстанцыі — кітайскія і індыйскія, а вырабляе свае ўласныя. Зрэшты, як аказалася, часам сінтэзаваць рэчыва больш выгадна, чым закупляць і чысціць.

## Клетачныя прадукты супраць раку і дыябету

Інстытут біяфізікі і клетачнай інжынерыі НАН Беларусі актыўна развівае кірункі клетачнай тэрапіі, ствараюцца арыгінальныя тэхналогіі вытворчасці біямедыцынскіх клетачных прадуктаў, у тым ліку тых, якія не маюць аналагаў у свеце.

У мінулым годзе тут паспяхова завяршылі клінічныя выпрабаванні дзевяці новых біямедыцынскіх клетачных прадуктаў для лячэння пацыентаў з рознымі захворваннямі, такімі як цукровы дыябет першага тыпу, рак мачавога пузыра, рак ныркі, гіпапаратэрыёз, цяжкія апёкі, сістэмны склероз, паліпозны рынасініт, дэфекты касцявой тканкі. У практычную работу лячэбных установ укаранёна дзесяць новых метадаў лячэння гэтых захворванняў.

Акрамя таго, у інстытуце ўпершыню ў Беларусі распрацаваны метады атрымання індуцыраваных плюрыпатэнтных ствалавых клетак з высокім патэнцыялам выкарыстання ў лячэнні шырокага спектра хвароб.

Распрацаваны таксама метады рэдагавання геному клетак чалавека для тэрапіі спадчынных і анкалагічных захворванняў.

Як адзначыў **акадэмік-сакратар аддзялення медыцынскіх навук Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Васіль БОГДАН,** акадэмічныя вучоныя актыўна супрацоўнічаюць з практычнай ахоўвай здароўя па ўкараненні і выкарыстанні інавацыйных медыцынскіх тэхналогій.

## Сумесна з Кубай, Індыяй і Кітаем

Высокі навуковы ўзровень стварэння лекаў у Беларусі пацвярджаецца пашырэннем геаграфіі навуковага супрацоўніцтва.

— Ствараюцца сумесныя даследчыя лабараторыі з калегамі з КНР. Можна прывесці прыклад стварэння сумеснай лабараторыі з магчымым выхадам на стварэнне сумеснага прадпрыемства калег з КНР і Гасразліковай доследнай вытворчасці Інстытута біяарганічнай хіміі, — расказаў **акадэмік-сакратар аддзялення хіміі і навук аб Зямлі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Аляксей ТРУХАНАЎ.**

Паводле яго слоў, пастаянна павялічваецца інтэнсіўнасць кантактаў з калегамі з Індыі, прычым сусветнымі фармлідарамі. У прыватнасці, прадпрыемства «Акадэмфарм» пастаянна вядзе перагаворы па пашырэнні наменклатуры прадукцыі. Таксама супрацоўнікі «Акадэмфарма» плануюць адкрыццё сумеснага прадпрыемства з калегамі з Кубінскай Рэспублікі.

— Усе нашы арганізацыі, якія ўваходзяць у фармакалагічны кластар, дастаткова цесна камуніцыруюць паміж сабой. Вучоныя-біяхімікі распрацоўваюць актыўныя формы лекавых сродкаў і перадаюць для вытворчасці на «Акадэмфарм», — адзначыў акадэмік-сакратар аддзялення. — Таксама мы камуніцыруем і на знешнім контуры з нашымі калегамі з Міністэрства аховы здароўя. Пастаянна ўзгадняецца спіс інавацыйных лекавых прэпаратаў, якія ўваходзяць у пералік тых, якія плануюцца да выпуску ў нашай краіне. На бліжэйшыя некалькі гадоў гэты пералік уключае ў прыватнасці па «ХімФармСінтэзе» 12 найменняў, па «Акадэмфарме» — 16.

Пры гэтым амаль на 100 мільёнаў рэалізавана прадукцыі па выніках завершаных распрацовак дзяржаўных навукова-тэхнічных праграм, паведаміў **начальнік аддзела навуковага забеспячэння праграм і экспертызы ўпраўлення навукова-тэхнічнай палітыкі і экспертызы Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Віктар ПАРАШКОЎ.** У тым ліку экспарт склаў больш як два мільёны.

У галіне медыцыны і фармакалогіі асноўныя навукова-тэхнічныя распрацоўкі выконваюцца ў рамках двух дзяржаўных навукова-тэхнічных праграм, дзяржаўным заказчыкам якіх з'яўляецца Міністэрства аховы здароўя. Адна з іх — «Навукова-тэхнічнае забеспячэнне якасці і даступнасці медыцынскіх паслуг» — накіравана на выкананне навукова-тэхнічных распрацовак літаральна ва ўсіх галінах аховы здароўя, у тым ліку ў кардыялогіі, анкалогіі, тэрапіі, хірургіі.

У ходзе дзяржаўнай навукова-тэхнічнай праграмы «Распрацоўка фармацэўтычных субстанцый, лекавых сродкаў і нарматыўна-прававога забеспячэння фармацэўтычнай галіны» распрацоўваюцца новыя як фармсубстанцыі, так і лекавыя сродкі, а таксама нарматыўная база па забеспячэнні вытворчасці гэтых прэпаратаў і рэчываў.

— Летась у рамках гэтых дзвюх праграм выконвалася 258 заданняў. Фактычна гэта назіраецца да паловы ўсіх тых заданняў, якія выконваюцца ў рамках навукова-тэхнічных праграм. Гэта значыць, медыцына тут наперадзе ўсіх астатніх дзяржзаказчыкаў, — адзначыў Віктар Парашкоў.

Ён заўважыў, што фактычны аб'ём фінансавання гэтых дзяржаўных навукова-тэхнічных праграм у 2023 годзе склаў больш як 28,5 мільёна. Было распрацавана 77 новаўвядзенняў. Асноўная колькасць датычылася розных метадычных рэкамендацый, новых метадаў лячэння, а таксама новых фармацэўтычных прэпаратаў.

Акрамя таго, навукова-тэхнічныя распрацоўкі па медыцыне і фармацэўтыцы выконваюцца і ў рамках дзяржаўных праграм, такіх як «Здароўе народа і дэмаграфічная бяспека», «Навукаёмістыя тэхналогіі і тэхніка».

**Алена КРАВЕЦ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Буйныя гарады на ўзбярэжжы ЗША асядаюць з вялікай хуткасцю



Спадарожнікавыя здымкі NASA зафіксавалі шакіруючую хуткасць асядання зямлі пад буйнымі гарадамі ЗША на ўсходнім узбярэжжы, паведаміў часопіс Live Science. У лік гарадоў, «якія тонуць», трапілі Нью-Ёрк, Балтымар і Чарльстан. Абсерваторыя NASA зрабіла здымкі зямной паверхні, на якіх прыкметныя вобласці, што апускаюцца пад ваду. Паводле даных, атрыманых са спадарожнікаў з 2007-га па 2020 год, зямля пад Нью-Ёркам, Балтымарам і Чарльстанам апускалася ў сярэднім на 1-2 міліметры ў год. Сучасныя даследаванні паказалі, што ў асобных рэгіёнах краіны гэты працэс паскорыўся ў два ці нават тры разы. Прасяданне глебы пад гарадамі пагражае павышэннем узроўню мора. А гэта ў сваю чаргу небяспечна для людзей і інфраструктуры, таму што непасрэдна звязана з узнікненнем паводак. Таксама асяданне глебы можа прывесці да пападання салёнай вады на сельскагаспадарчыя палеткі і ў запасы прэснай вады.

## Талібы арыштоўваюць афганскіх жанчын за парушэнне ісламскага дрэс-кода



Спецпрадстаўнік генеральнага сакратара ААН у Афганістане Роза Атунбаева заявіла, што рух «Талібан», які захапіў уладу ў краіне, пачаў арыштоўваць афганскіх жанчын за невыкананне ўказа аб нашэнні хіджабу. «Дэ-факта ўлады Афганістана за апошні час яшчэ больш абмежавалі правы жанчын ва ўсіх сферах грамадскага жыцця. Жанчыны, хто, як лічыцца, не ў поўнай меры выконваюць указ аб нашэнні хіджабу, падвяргаюцца арыштам і затрыманням. Некаторыя жыхаркі Афганістана апасаюцца выходзіць на вуліцу», — сказала Атунбаева, выступаючы перад членамі Савета бяспекі ААН. У пачатку студзеня заснаванае талібамі міністэрства прапаганды дабрадзейнасці і прадухілення заганы пачало актыўна праводзіць у жыццё выдадзены ў красавіку 2022 года ўказ аб нашэнні хіджабу, арыштоўваючы і заключаючы пад варту абвінавачаных у яго невыкананні жанчын і дзяўчат.

## Латвія можа сутыкнуцца з дэфіцытам медыкаментаў



Латвія ў любы момант можа сутыкнуцца з дэфіцытам медыкаментаў, бо 94 працэнты рынку лекаў складаецца з імпарту. Краіна залежыць ад паставак і квот. Пра гэта заявіў член праўлення Латвійскай асацыяцыі забеспячэння медыкаментамі Яніс Лібкенс, паведамляе rus.lsm.lv. Па словах Яніса Лібкенса, каб пазбегнуць недахопу прэпаратаў, у краіне неабходна рабіць запасы медыкаментаў на паўгода наперад: «Мы вельмі залежым ад паставак, і гэта галоўнае абгрунтаванне, таму патрэбны запасы на 3—6 месяцаў». Лібкенс адзначыў, што ў краіне вырабляюць медыкаменты каля 20 прадпрыемстваў і доля мясцовых лекаў на рынку складае ўсяго шэсць працэнтаў. Як вядома, праблема недахопу лекаў актуальная не толькі ў Латвіі, але і ва ўсёй Еўропе.

# ТУРЫСТЫЧНЫ РЭЗОН



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Той глабальнай плыні турыстаў з усяго свету няма, аднак склаліся стасункі з шэрагам постсавецкіх краін і, вядома, з Расіяй. Набіраюць абароты адносіны з такімі краінамі дальняй дугі, як Індыя і Кітай. Прамыя сувязі з расійскімі рэгіёнамі, мінаючы Маскву, устанавіліся і працягваюць устанаўлівацца два апошнія гады. Многія рэгіёны Расіі настолькі самабытныя, маюць уласныя авіякампаніі, што іх можна разглядаць як самастойныя напрамкі, — акрэсліў сітуацыю **старшыня праўлення Рэспубліканскага саюза турыстычнай індустрыі Філіп ГУЛЫ.**

Масквічы заўсёды былі частымі і жаданымі турыстамі ў нашай краіне. Жыхары расійскай сталіцы і Маскоўскай вобласці прыязджаюць у туры выхаднога дня, на санаторна-курортнае лячэнне. Сёння трэнд змяніўся ў бок маржынальнасці тураў, у прыватнасці, для пражывання госці выбіраюць больш дарагія атэлі.

Атрымліваюць развіццё і новыя кірункі — развіццё дзелавога турызму, бізнес-трэвэл, работа з карпаратыўнымі кліентамі.

— Гэта праблема не толькі Мінска, але і Расіі, і Анталы, і Тбілісі, і Баку: адначасова прыняць мерапрыемства на тысячу чалавек. Іх трэба прывезці, размясціць прыкладна ў пяці гасцініцах, накарміць, і пры гэтым упісацца ў бюджэт. А ён у Расіі складае на мерапрыемства з тысячы чалавек на 4-5 дзён каля 120 мільёнаў расійскіх рублёў. Упісацца ў яго складана. І гэта наша задача на бліжэйшыя некалькі гадоў. Мы ў больш выйгрышнай сітуацыі, бо везці людзей нашмат бліжэй з Масквы ў Мінск. Гэта адлегласць можа быць пераадолена з дапамогай аднаго заказнога цягніка, — адзначыў Філіп Гулы.

Сёння актыўна развіваюцца туры ў рэгіёны Расіі. З гэтага года новым напрамкам стане Рэспубліка Дагестан. З канца вясны «Белавія» запускае новы рэйс, і для беларусаў падарожжа на Каспійскае мора цяпер стане больш даступным.

Бадай, самым яркім прыкладам эфектыўнага супрацоўніцтва з расійскім рэгіёнаў з'яўляецца Башкартастан. Там ажыццяўляецца падтрымка рэйса Уфа — Мінск, які выконваецца расійскай авіякампаніяй, і субсідзіруецца ён вельмі эфектыўным спосабам — падтрымкай праекта «Башкирское даўгалецце». У яго рамках пенсіянеры са значнай зніжкай могуць набыць тыднёвае падарожжа ў гэты рэгіён. Праграма добра сябе зарэкамендавала ў 2023 годзе і працягваецца сёлета. Цяпер прапрацоўваецца і яшчэ адна праграма — запуск патрыятычных тураў для школьнікаў Рэспублікі Башкартастан у Беларусь.

Выбудоўваюцца адносіны і з іншымі рэгіёнамі — Ніжагародскай вобласцю, Пермскім краем і іншымі. Нягледзячы на адсутнасць прамога авіярэйса, цікавасць да ўзаемавыгадных адносін праяўляе Новасібірск.

За турыстаў з Беларусі борацца і іншыя рэгіёны — ад Татарстана да рэспублік Паўночнага Каўказа і расійскіх паўднёвых курортаў. У Расіі вядзецца актыўнае будаўніцтва турыстычнай інфраструктуры, у прыватнасці, летась на 16 % вырас нумарны фонд, і суседняя краіна ў стане задавальняць любыя патрэбы.

## ГУКАННЕ ВЯСНЫ, ВАДЖЭННЕ СТРАЛЫ, МАСЛЕНІЦА

Новымі мерапрыемствамі гатовы здзівіць турыстаў і ў Беларусі. Сарыентавацца ў іх разнастайнасці дапаможа сайт www.belarustourism.by, дзе Нацыянальнае агенцтва па турызме друкуе каляндар найбольш цікавых падзейных мерапрыемстваў ва ўсіх рэгіёнах. Тут жа размяшчаюцца кантакты арганізатараў. На сайце ru.belarus.travel каляндар падзей даступны ў інтэрактыўным выглядзе. Там жа можна скарыстацца фільтрам па рэгіёне і даце. З дапамогай гэтых рэсурсаў можна планаваць свае падарожжы ва ўсіх рэгіёнах. На сайце ru.belarus.travel прадугледжаны маршрутызатар, які дазваляе спланаваць па дарозе на падзейнае мерапрыемства наведванне культурных ці гістарычных аб'ектаў, аграсядзібы ці санаторыя.

— Вясну мы бачым каляндарна-абрадавай. Бліжэйшыя падзеі — Гуканне вясны і Масленіца. Гэты святочны тыдзень пачнецца з 11 сакавіка. Масленіца плаўна пераходзіць у Вялікдзень. Музейныя ўстановы стараюцца гэтыя каляндарна-абрадавыя святы ярка прадэманстраваць у выглядзе інтэрактыўных праграм, фестывальных мерапрыемстваў. У Дзяржаўным музеі народнай архітэктуры і побыту 16 сакавіка запланаваны разнастайныя масленічныя мерапрыемствы. У красавіку і маі таксама чакаюцца цікавыя мерапрыемствы — Ваджэнне стралы, абрад Юр'е. Яны будуць адзначацца на аграсядзібах і ў музеях, — расказаў **дырэктар Нацыянальнага агенцтва па турызме Дзмітрый МАРОЗАЎ.**

У вясновым календары шэраг мерапрыемстваў, якія прымеркаваны да 9 Мая. Яны традыцыйна прыцягваюць у Беларусь турыстаў з розных краін.

— З канца красавіка да 10 мая самы ажыўлены вясенні турыстычны сезон. Таму планаваць у гэты час падарожжы лепш загадзя, — парэкамендаваў кіраўнік Нацыянальнага агенцтва па турызме.

Гэтай вясной чакаецца і шэраг навінак. Сярод іх — майскі баль у сядзібе Нямцэвічаў. Ён пройдзе 18 мая. Гэта новы тып мерапрыемстваў, якія з нядаўняга часу ладзяцца ў палацавых комплексах — Нясвіжскім, Мірскім замках і сядзібе Агінскіх у Залессі.

Багатая сёлетняя вясна і на юбілейныя мерапрыемствы. У Полацку адзначаць юбілей манастыра, і ўвесь турыстычны сезон для наведвальнікаў падрыхтаваны цікавыя падзеі. Сярод знакавых мерапрыемстваў рэлігійнага турызму — свята з'яўлення іконы Божай Маці Жыровіцкай, якое адзначаць у Жыровіцкім манастыры 20 мая.

Апроч гэтага, кожны вясновы месяц прысвечаны пэўнаму накірунку. З 1 сакавіка пачаўся месяц прамысловага турызму. Запланаваны шэраг мерапрыемстваў, у тым ліку вялікі міжнародны форум на базе Мінскага трактарнага завода, прысвечаны развіццю гэтага накірунку. Красавік будзе прымеркаваны да развіцця дзелавога турызму. Ключавой падзеяй месяца стане турыстычная выстава з 18 да 20 красавіка. Май прысвечаны агратурызму — яшчэ аднаму яркаму брэнду Беларусі.

## «МАРТ-КАНТАКТ» — ПАДЗЕЯ ДЛЯ ТЭАТРАЛАЎ

Для тэатралаў ключавой падзеяй вясны бясспрэчна стане 17-ы Міжнародны маладзёжны фестываль «Март-кантакт», які прыме Магілёў. 20 сакавіка ён распачнецца спектаклем «Жаніцьба». Сёлета ў рамках фестывалю будзе прадстаўлена больш за 20 спектакляў шасці краін-удзельніц — Арменіі, Балгарыі, Беларусі, Казахстана, Кыргызстана, Расіі.

Традыцыйна фестываль працягнецца тыдзень і скончыцца ў Дзень тэатра, 27 сакавіка.

— Урачыстае адкрыццё прызначана на 21 сакавіка спектаклем «Антарктыда» тэатра «На Ліцейным» (Санкт-Пецярбург). Таксама сёлета запрошаны спецыяльны госць фестывалю, заслужаная артыстка Расіі Ганна Бальшова. 23 сакавіка яна правядзе сустрэчу з гледачамі. З незвычайнага — дадатковы паказ начнога спектакля «Вій» тэатра «У моста» (Перм). Будзе працаваць лабараторыя маладой рэжысуры, і 27 сакавіка ўдзельнікі пакажуць эскізы, мяркуецца адкрытае абмеркаванне з гледачамі і маладзёжнае журы са студэнтаў ГІТІСа. Пасля фестывалю плануюцца гастролі «Каляда-тэатра» (Екацярынбург), — расказала **рэжысёр-пастаноўшчык заслужанага калектыву Рэспублікі Беларусь «Магілёўскі абласны драматычны тэатр» Каміля ХУСАІНАВА.**

## ЧЫМ ЗДЗІВІЦЬ СТАЛІЦА?

Адным з эпіцэнтраў яркіх падзей, безумоўна, з'яўляецца Мінск. Штогод у беларускай сталіцы праходзіць каля 300 значных мерапрыемстваў, усяго ж іх каля 600. Толькі ў перыяд навагодніх свят Мінск арганізаваў каля 200 мерапрыемстваў. Найбольшай папулярнасцю карысталіся інтэрактыўныя прадстаўленні каля Ратушы, на сцэне побач з Палацам спорту, на вуліцы Ракаўскай.

Летась у сталіцы аднавіўся гарадскі музычны праект «Пешаходка». З чэрвеня 2023 года прайшло 563 выступленні вулічных музыкантаў на тэрыторыі Верхняга горада ў некалькіх лакацыях: Музычны завулак, вуліца Герцана і інсталяцыя Васілёк, набярэжная Троіцкага прадмесця і пляцоўка на вуліцы Ракаўскай, 25. З мая праходзілі тэатралізаваныя перформансы «Каля Ратушы». Мерапрыемствы наведала больш за 1,6 мільёна чалавек.

Вясной сталічныя музеі, тэатры, выставачныя залы завабліваюць наведвальнікаў разнастайнымі праграмамі. На тэрыторыі батанічнага сада праводзяцца выставачныя, тэматычныя, асветніцкія, забаўляльныя мерапрыемствы. Выстаўка «Дыханне кветак» пачалася з 1 сакавіка і працягнецца да 10 сакавіка, а выстаўка «Вясна ў садзе ліхтароў» — з 1 сакавіка да 28 красавіка.

Традыцыйнымі сталі гастрафэсты, якія арганізуюць установы грамадскага харчавання. Ва ўсіх кафэ розныя тэмы, але адна механіка — яны прапануюць свае найлепшыя сэты па фіксаванай цане ў пэўны перыяд. З 8 да 18 сакавіка пройдзе першы з іх, наступны — «Краіны свету» — з 18 красавіка да 5 мая.

Ладзіць разнастайныя праграмы і Лошыцкі парк. Гэта філіял Музея гісторыі горада Мінска са старым сядзібным комплексам і музеем. Акрамя прагулак па парку і экспазіцыі наведвальнікам прапануецца акунуцца ў свет музыкі і тэатра.

Запланавана ў Мінску шмат выставак. Нацыянальны мастацкі музей запрашае на выстаўку «Мастацкаму-85», якая працягнецца з 28 сакавіка да 28 красавіка. Нацыянальны цэнтр сучасных мастацтваў і галерэя FARBA запрашаюць наведаць новы выставачны праект «Страсці па архітэктуры». 8—10 сакавіка ў крытым лёгкаатлетычным комплексе «Дынама» пройдзе выстаўка пародзістых коней «Вясна-2024», з 7 да 9 сакавіка вясенняя выстаўка аўтарскіх вырабаў «Чароўны Млын» у выставачным комплексе па пр-це Пераможцаў, 14.

Усяго вясной у Мінску пройдзе больш за 30 міжнародных выставак.

— Сталіца рыхтуецца да 80-годдзя вызвалення Беларусі. Святочна аформіць горад плануецца да 1 мая. Мяркуецца, што сталіца ў свята будзе ўвасабляць тую атмасферу, якая панавала ў горадзе 80 гадоў таму, калі пераможцы прыйшлі ў Мінск. Святочна аформлены будуць плошчы Перамогі і Кастрычніцкая, праспекты Пераможцаў і Незалежнасці, — расказаў **дырэктар інфармацыйна-турыстычнага цэнтра «Мінск» Аляксей РУСАКЕВІЧ.**

## «АДПАЧЫНАК-2024»: 600 ЭКСПАНЕНТАЎ

Адным са знакавых мерапрыемстваў вясны стане Міжнародная выстаўка-кірмаш турысцкіх паслуг «Адпачынак-2024», якая пройдзе з 18 да 20 красавіка на пляцоўцы «Мінск-Арэны» ў будынку канькабежнага стадыёна. Арганізатарамі гэтай турыстычнай падзеі, якая, дарэчы, праводзіцца ўжо 26-ы раз, выступаюць Нацыянальны выставачны цэнтр «БелЭкспа», Міністэрства спорту і турызму, Нацыянальнае агенцтва па турызме. Будуць прадстаўленыя ўсе рэгіёны Беларусі, а таксама замежныя кампаніі — усяго больш за 600 экспанентаў, з іх каля 100 замежных кампаній.

— Удзел пацвердзілі 16 рэгіёнаў Расіі і Куба. На сцэне выступяць Пасольства Ісламскай Рэспублікі Пакістан у Беларусі, Пасольства Турэцкай Рэспублікі і Пасольства Рэспублікі Куба, — расказала **начальнік упраўлення выставак і кірмашоў Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Нацыянальны выставачны цэнтр «БелЭкспа» Вольга КРАСОЎСКАЯ.**

Сёлета адначасова з «Адпачынкам-2024» пройдзе міжнародная спецыялізаваная выстаўка-кірмаш «Паляванне і рыбалоўства», дзе аматары актыўнага адпачынку могуць набыць усе неабходныя рэчы: лодкі, снасці, спецыяльнае адзенне. Нацыянальныя паркі прадэманструюць свае спецыяльныя прапановы, новыя турыстычныя маршруты і экскурсійныя праграмы.

Дзелавая праграма выстаўкі прадугледжвае круглыя сталы і сесіі, а ключавым мерапрыемствам стане 2-гі Расійска-беларускі турыстычны кангрэс. Традыцыйна наведвальнікаў чакаюць конкурсы і прызы. Уваход вольны па папярэдняй рэгістрацыі на сайце tourexpo.by.

**Алена КРАВЕЦ.**

Надвор'е

# СПАЧАТКУ СОНЦА І МАРОЗІК, А ПОТЫМ МОКРЫ СНЕГ І ГАЛАЛЁД З ТУМАНАМ

**«Кавалачак» скандынаўскага антыцыклону прынёс у краіну сухое, халоднае, але пры гэтым сонечнае надвор'е. Аж да 11 сакавіка пад уплывам вобласці павышанага атмасфернага ціску істотных ападкаў па краіне не чакаецца. Разам з тым ноччу будзе марозна, а днём цалкам па-вясноваму, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Сёння чакаецца пераважна без ападкаў. Ноччу і раніцай у асобных раёнах слабыя туман і галалёд. Уначы тэмпература будзе ў межах ад мінус 1 да мінус 7 градусаў, а ўдзень — ад мінус 1 градуса на паўночным усходзе да плюс 8 градусаў на паўднёвым захадзе нашага рэгіёна.

У нядзелю таксама будзе пераважна без ападкаў. Ноччу і раніцай у асобных раёнах слабыя туман і галалёд. Тэмпература паветра ўначы дасягне мінус 2—8 градусаў, а ўдзень — ад нуля да 6 градусаў з плюсам. Па паўднёвым захадзе ноччу будзе ад нуля да мінус 1 градуса, днём — плюс 7—8 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў сіноптыкаў, з пачаткам новага працоўнага тыдня антыцыклон пачне губляць свой уплыў на надвор'е ў нашай краіне. Ціск пачне падаць, павялічыцца колькасць аблокаў, атмасферны фронт з Карпат прынясе да нас у краіну ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. Ноччу і раніцай у асобных раёнах чакаюцца слабыя туман і галалёд, на дарогах галалёдзіца.

У панядзелак пераважна без ападкаў, толькі па паўднёвым захадзе краіны пройдуць кароткачасовыя ападкі, у асноўным мокры снег, дождж. Ноччу і раніцай у асобных раёнах слабыя туман і галалёд, на дарогах галалёдзіца. Уначы сіноптыкі абяцаюць мінус 6 — плюс 1 градус, пры праясненнях — да мінус 9 градусаў, удзень — ад нуля да 7 градусаў цяпла.

З аўторка надвор'е будзе «так сабе». У гэты дзень месцамі, пераважна па поўдні краіны, чакаюцца кароткачасовыя ападкі, у асноўным мокры снег, дождж. Ноччу і раніцай у асобных раёнах слабыя туман і галалёд, на дарогах галалёдзіца. Уначы прагназуецца мінус 5 — плюс 2 градусы, а пры праясненнях — да мінус 8 градусаў. Днём тэмпература паднімецца да 7 градусаў цяпла.

Амаль зімовае надвор'е чакаецца і ў сераду. У гэты дзень на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. У начныя і ранішнія гадзіны ў асобных раёнах слабыя туман і галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 5 градусаў да плюс 2. Днём паветра прагрэецца ад нуля да 7 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Старты

# Для кожнага — свая вышыня

**У гэтыя выхадныя тэлеканал «Расія-Культура», як заўсёды, будзе радаваць прыемнымі прапановамі. Прапануем звярнуць увагу на дакументальны фільм з цыкла «Зорныя партрэты» і на старт праекта «Вялікі балет».**



Апошні дасць магчымасць тэлегледачам прычыніцца да мастацтва вядучых тэатраў Расіі і труп з краін блізкага і далёкага замежжа. Так, сярод удзельнікаў — Марыінскі тэатр, Вялікі тэатр Расіі, Міхайлаўскі тэатр, Новасібірскі тэатр оперы і балета, Вялікі тэатр Беларусі (салісты трупы «Балет Лауры Алонса»), Вялікі тэатр оперы і балета Узбекістана. У першым выпуску праекта выступяць 16 удзельнікаў (шэсць дуэтаў і чатыры салісты). І ніхто з удзельнікаў не выбывае. Падчас знаёмства яны прадставяць увазе публікі і журы па-дэ-дэ і сольныя нумары, а таксама харэаграфічную мініяцюру на музыку Сяргея Рахманінава і фрагмент балета на музыку Фрэдэрыка Шапэна.

А вось дакументальны фільм «Юрый Гагарын. Зорны выбраннік» выйдзе ў дзень 90-годдзя сусветнавядомага касманаўта. Кінаработа пазнаёміць тэлеаўдыторыю са шляхам чалавека, якога лёс прывёў у космас. Штурвал самалёта апынуўся ў руках Юрыя яшчэ ў дзяцінстве — падчас вайны. А ў Саратаўскім індустрыяльным тэхнікуме яму даручылі зрабіць даклад пра Цыялкоўскага. Пасля гэтага ён прыняў канчатковае рашэнне стаць лётчыкам і паступіў у аэраклуб. Затым — атрад касманаўтаў і першы палёт у космас...

Як усё тое адбывалася і фарміравала Юрыя Гагарына, раскажуць у кадры яго калегі, сябры і родзічы. Не прапусціце прэм'еры сёння на тэлеканале «Расія-Культура».

**Алена ДРАПКО.**

## ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 193

**Наступную задачу склалі Іван Бондар і Мікалай Агейка з Ганцавіч (*гл. дыяграму*).**



**Белыя:** Kpf7, Фg2, Ch1, Kd7, Ke6, пс2 (6).
**Чорныя:** Kpf5, пп. с3, d5, e4, f2, f6, g3, g4 (8).

**Мат за два хады.**

**Дасылайце адказы на адрас рэдакцыі (вул. Хмяльніцкага, 10а, 220013, г. Мінск, «Звязда») або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru**

* * *

Праграма шахматнага фестывалю ў Оршы складалася з васьмі турніраў (з іх два — па бліцы).

У галоўным турніры гулялі 133 удзельнікі з шасці краін, у тым ліку тры гросмайстры, чатыры міжнародныя майстры, 10 майстроў FIDE. Доўгі час лідзіраваў майстар FIDE Міхей Навуменка, але ў апошнім туры яго перамог гросмайстар Аляксей Аляксандраў, які ў выніку і заняў першае месца, — 7,5 бала з 9 магчымых. Месцы з другога да сёмага занялі адпаведна міжнародны майстар Вячаслаў Зарубіцкі, гросмайстар Кірыл Ступак, Міхей Навуменка і расійскія шахматысты Дашы Дамбаеў, Аляксей Пруцкоў, Арцём Горлаў (па 7 балаў). Сярод жанчын найлепшую тройку склалі майстар FIDE Варвара Палякова (10-е месца), міжнародны майстар з Расіі Маргарыта Патапава (12-е) і Ксенія Норман (16-е).

У галоўным турніры па бліцы (112 удзельнікаў з пяці краін, у тым ліку чатыры гросмайстры, пяць міжнародных майстроў, дзевяць майстроў FIDE) 1-е-2-е месцы падзялілі расійскія майстры FIDE Аляксандр Хрыпачэнка і Максім Волкаў — па 9 балаў з 11. 3-е-4-е месцы занялі А. Аляксандраў і расійскі гросмайстар Андрэй Рычагоў — па 8,5. Сярод жанчын найлепшая Ксенія Зелянцова (19-е месца).

* * *

У Мінску адбыўся Мемарыял Д. Бранштэйна. Пра гэты турнір — у наступным выпуску.

У аўстрыйскім Грацы (153 удзельнікі) Арцём Стрыбук заняў шостае месца. У турнірах па бліцы на сайце chess.com Дзяніс Лазавік заняў 4-е месца з 783, 39-е з 551 і 36-е з 693.

Зборная Беларусі фінішавала чацвёртая ў VII Кубку славянскіх краін па завочных шахматах (11 каманд). Прызавую тройку тут склалі Славакія, Славенія і Украіна.

* * *

Прапануем некалькі партый з нядаўніх першынстваў Беларусі да 18 гадоў.

